*ЧАЛАВЕК ГОДА ВІЦЕБШЧЫНЫ*

# Прысвоена ганаровае званне



Падведзены вынікі штогадовага абласнога конкурсу па прысваенні ганаровага звання "Чалавек года Віцебшчыны", які праводзіцца з мэтай стымулявання творчай працы, прапаганды інавацыйных ідэй, перадавога вопыту.

Учора ў Віцебску прайшла ўрачыстая цырымонія ўнагароджвання паўсотні прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці. Сярод лаўрэатаў ганаровага звання "Чалавек года Віцебшчыны" – загадчык аддзялення сацыяльнай дапамогі на даму ДУ "Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Докшыцкага раёна" Данута Лявоха.

Прэмія "Чалавек года Віцебшчыны" ўручаецца штогод з 2009 года. Яе лаўрэатамі сталі больш за 700 чалавек паўночнага рэгіёна краіны.

**Падрыхтавала Наталля ВАСЬКО.**